# Аб выніках XXV рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»

*(Працяг. Пачатак на стар. 1)*

**Трэцяе месца** ў намінацыі «За пошукавую і даследчую працу» заняла *Цэнтральная раённая бібліятэка г. Жабінкі*. Бібліятэкарамі ажыццяўляецца даследаванне і збор матэрыялаў аб удзеле ваеннаслужачых Жабінкаўскага раёна ў баявых дзеяннях у Афганістане, успамінаў воінаў-інтэрнацыяналістаў аб афганскіх падзеях. У выніку пошукавадаследчай работы супрацоўнікамі бібліятэкі створаны электронны рэсурс – база дадзеных «Афганістан: наша памяць і боль», якая карыстаецца значным попытам у чытачоў бібліятэкі. Пры падрыхтоўцы базы дадзеных былі выкарыстаныя паўнатэкставыя матэрыялы, фотадакументы, а таксама пісьмы, перададзеныя воінамі-афганцамі або іх родзічамі з розных архіваў, рэсурсаў інтэрнэта.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, **трэцяе месца** атрымала *Махроўская сельская бібліятэка Іванаўскага раёна*. Адраджэнне самабытнай беларускай культуры, захаванне фальклорнай спадчыны, папулярызацыя матэрыялаў аб жыцці знакамітых землякоў, вывучэнне гісторыі свайго краю, стварэнне шэрагу значных гісторыка-краязнаўчых і літаратуразнаўчых матэрыялаў аб родным краі – асноўныя напрамкі краязнаўчай дзейнасці гэтай бібліятэкі. Вынікам такой работы стала напісанне бібліятэкарам летапісу в. Махро. На яго старонках прадстаўлены запісы сустрэчаў з вясковымі старажыламі, іх успаміны, фотадакументы, копіі матэрыялаў з сямейных архіваў, школьнага краязнаўчага музея. Матэрыялы, прадстаўленыя ў летапісе, кожны год дапаўняюцца і ўдакладняюцца, а потым выкарыстоўваюцца пад час падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемстваў.




*Матэрыялы бібліятэк-пераможцаў у намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»*

У намінацыю «**За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем**» бібліятэкамі было даслана 9 прац.

Лепшай сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прызнана *Цэнтральная гарадская дзіцячая бібліятэка г. Баранавічы* за папулярызацыю беларускай кнігі ў дзіцячым асяроддзі сродкамі інавацыйных формаў масавай работы. Бібліятэкай рэалізаваны крэатыў-праект «Вясёлка юбілейных падзей», асноўнай задумкай якога з'яўляецца адзначэнне юбілеяў пісьменнікаў ці кніг у бібліятэцы цікавымі, нестандартнымі мерапрыемствамі, у аснове якіх – камп'ютарныя тэхналогіі. У выніку ажыццяўлення крэатыў-праекта ў бібліятэкараў атрымалася зацікавіць юных чытачоў, выклікаць у іх яркія ўражанні, сфармаваць станоўчую матывацыю да чытання беларускай кнігі, павагу і любоў да роднай мовы.

**Першая прэмія** сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк прызначана *Чэрнеўскай сельскай бібліятэцы Дрыбінскага раёна* за плённую працу ў напрамку нацыянальнага адраджэння, выхавання любові і павагі да роднага краю, цікавасці да вывучэння гісторыі сваёй вёскі сярод падрастаючага пакалення. З 2014 г. бібліятэкай паспяхова рэалізуецца мэтавы праект «Беларускія канікулы ў сельскай бібліятэцы». Праект прадстаўляе комплекс напрамкаў і мерапрыемстваў па арганізацыі занятасці, адпачынку дзяцей і падлеткаў у цеснай сувязі з народнымі традыцыямі гэтай мясцовасці. Больш за 100 арыгінальных экспанатаў вясковага побыту сабрана ў этнаграфічным пакоі бібліятэкі «Ад родных вытокаў», распрацаваны і ўкараняецца ў жыццё краязнаўчы маршрут «Сцяжынкамі роднага краю».

**Другое месца** ў намінацыі заняла *Горацкая раённая дзіцячая бібліятэка*. Умела выкарыстоўваючы розныя формы, метады, прыёмы і сродкі работы, дзіцячая бібліятэка імкнецца ахапіць усе напрамкі бібліятэчнай асветы, ствараць спрыяльныя ўмовы для захавання і адраджэння нацыянальных культурных здабыткаў, гістарычнай спадчыны, выхавання ў падрастаючага пакалення павагі і гонару за Радзіму, стварыць умовы для прасоўвання кнігі і чытання, павышэння прававой культуры чытачоў, патрэбнасці весці здаровы лад жыцця, фармавання маральнай асобы. Гэта патрабуе пастаянных намаганняў і сістэмнай працы з боку бібліятэкараў, што яны і адлюстравалі ў «Азбуцы бібліятэкі». Арыгінальна афармленая праца падрабязна адлюстроўвае дзейнасць бібліятэкі па ўсіх яе напрамках на кожную літару алфавіта.

**Другой прэміяй** сярод бібліятэк, размешчаных у сельскай мясцовасці, журы адзначыла *Камянюцкую сельскую бібліятэку-філіял № 20 Камянецкага раёна*. Цікавую комплексную работу праводзіць бібліятэка па прывіцці дзецям і падлеткам беражлівага стаўлення да навакольнага асяроддзя, фармаванні экалагічнай культуры. Сістэмны і паслядоўны характар экалагічнага выхавання юных карыстальнікаў забяспечвае мэтавая праграма «Жыві, Зямля» (2016 – 2020 гг.), якая стала працягам праграмы «Стань для прыроды сябрам» (2013 – 2015 гг.). Выклікаюць інтарэс змястоўныя пасяджэнні і арганізаваныя ў бібліятэцы цікавыя мерапрыемствы аматарскім аб'яднаннем «Юны эколаг».

На **трэцяе месца** ў гэтай намінацыі вылучаная *бібліятэка-філіял № 2 г. Гомеля*. Прапаганда беларускай нацыянальнай спадчыны з'яўляецца прыярытэтным напрамкам асветніцкай дзейнасці бібліятэкі, якую яна вядзе з дапамогай экспанатаў бібліятэчнага музея народнага побыту. Калекцыя музея пасля з'яўлення двух праектаў, «Часоў злучальная нітка» і «У родным слове – цэлы свет», работа па прыцягненні дзяцей да вывучэння беларускай традыцыйнай культуры значна актывізавалася. У рамках гэтых праектаў супрацоўнікі бібліятэкі праводзяць тэматычныя экскурсіі з элементамі тэатралізацыі і майстар-класамі, прысвечаныя беларускаму традыцыйнаму побыту, ежы, вопратцы, рукадзеллю, урокі, фальклорныя вечары і святы, гадзіны краязнаўства, выстаўкі як у бібліятэцы, так і па-за ёю.




*Матэрыялы бібліятэк-пераможцаў у намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання»*

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк **трэцяе месца** прысуджанае *Дварышчанскай сельскай бібліятэцы Лідскага раёна*. Своеасаблівым брэндам бібліятэкі з'яўляюцца ўнікальныя краязнаўчыя матэрыялы па гісторыі вёскі Дварышча, яе знакамітых землякоў, сабраныя па каліўцах з розных крыніцаў, з успамінаў сваякоў і аднавяскоўцаў. Дзякуючы намаганням і стараннямі бібліятэкара пры ўстанове створаны этнаграфічны пакой «Спадчына», дзе сабраная калекцыя, што налічвае больш за 100 экспанатаў беларускага побыту: макет печы, прылады селяніна, рэчы хатняга побыту, адзенне селяніна сярэдзіны XIX – пачатку XX ст., рэчы-сведкі Вялікай Айчыннай вайны, вырабы народнага тэкстылю (абрусы, посцілкі, ручнікі з самаробнага палатна).

У намінацыю «**За падтрымку і развіццё чытання**» бібліятэкі прадставілі на разгляд журы 9 прац.

Лепшай сярод гарадскіх і раённых бібліятэк стала *Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік*. Бібліятэкары займаюцца вывучэннем гісторыі краю і зберажэннем культурных традыцый, праводзяць вялікую работу па ўшанаванні памяці выдатнай паэткі Ганны Новік, прапагандуюць творчасць мясцовых паэтаў. У бібліятэцы распрацаваны і з поспехам рэалізуецца праект «Чытаем кнігі мясцовых аўтараў» (2014 – 2017 гг.). У рамках праекта бібліятэкары актыўна прапагандуюць творчасць мясцовых аўтараў, выкарыстоўваючы інавацыйныя формы і метады: размяшчаюць вершы паэтаў на сайце бібліятэкі, ствараюць электронныя прэзентацыі, буктрэйлеры; выдаюць і прэзентуюць зборнікі мясцовых паэтаў. Важным дасягненнем бібліятэкі з'яўляецца стварэнне калекцыі кніг мясцовых аўтараў з аўтографамі.

**Першую прэмію** сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк атрымала *Салтаноўская сельская бібліятэка Рэчыцкага раёна*, якая з'яўляецца для вяскоўцаў не толькі інфармацыйна-культурным цэнтрам, але і месцам, дзе можна знайсці падтрымку творчых задумак. У сваёй рабоце бібліятэка карыстаецца інавацыйным падыходам, у аснове якога – інтэрактыўныя формы правядзення масавых мерапрыемстваў: прэзентацыі кніг, хіт-парады, флэшмобы, віртуальныя турнэ, мастац-
ўвага бібліятэкара надаецца мастацкаму афармленню памяшкання – бібліятэка выглядае як святочная пляцоўка: усюды яркія фарбы, кветкі, драпіроўкі з тканіны, казачныя персанажы. Рэалізаваць крэатыўныя ініцыятывы дае магчымасць аматарскае аб'яднанне «Авангард».

**Другое месца** ў намінацыі «**За падтрымку і развіццё чытання**» прысуджанае *дзіцячай бібліятэцы № 10 г. Мінска*. Вялікую ўвагу бібліятэка надае папулярызацыі кнігі і асабліва чытання дзяцей і падлеткаў. Яна з поспехам рэалізуе шэраг праектаў, напрыклад: «Школа сямейнага выхавання», «Расцём з цікавай кнігай», «KINOманія», «"Играй & К°" – гульнявая пляцоўка». На развіццё ў падрастаючага пакалення патрэбнасці ў пастаянным удумлівым чытанні накіраваная комплексная мэтавая праграма «Чытанне дзяцей – каштоўнасць сучаснай культуры».

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк на **другое месца** журы вылучыла *Пагародзенскую сельскую бібліятэку Воранаўскага раёна* за актывізацыю цікавасці дзяцей да беларускай літаратуры, нацыянальнай культуры, мовы. Бібліятэка актыўна працуе па мэтавай праграме «Я люблю свой родны край» (2016 – 2020 гг.), галоўнай мэтай якой з'яўляецца адраджэнне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны роднага краю. Распрацаваная і паспяхова рэалізуецца праграма летняга чытання «100 ідэяў для лета». Шмат мерапрыемстваў праходзіць пад час Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі. Супрацоўнікі бібліятэкі цікава праводзяць летнія чытанні пад адкрытым небам, у гарадскім скверы, на пляцоўцы каля бібліятэкі.

*Наталля КАРНЯЙЧУК,*
*вядучы бібліятэкар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*
*Вольга КАКШЫНСКАЯ,*
*галоўны бібліятэкар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

*(Заканчэнне ў наступным нумары)*